# Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Трактор МТЗ-80Л, год выпуска 1993, № рамы (VIN) 898484, трактор колесный универсально-пропашной с колесной формулой 4*2, цвет – синий, полная масса – 4400, двигатель – дизель, 4 цилиндра, 4750 см. куб., 60 kw, 81 л.с. |
| **Начальная цена продажи** | 2 236,79 р. (две тысячи двести тридцать шесть рублей семьдесят девять копеек) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 224 р. (двести двадцать четыре рубля) |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Автомобиль МАЗ 5337А2-341, 2008 г.в., № рамы (VIN) Y3M5337A280000767, кузов грузовой специальный цистерна, цвет – белый, формула 4*2, полная масса 18 000, двигатель – дизельный 6 цилиндровый 11150 см. куб. 169 kw 230 л.с., ЯМЗ-236НЕ-2, пробег 256 351 км |
| **Начальная цена продажи** | 14 336,63 р. (четырнадцать тысяч триста тридцать шесть рублей шестьдесят три копейки) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1433 р. (одна тысяча четыреста тридцать три рубля) |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Продавец** | ОАО «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, 8-0154-550-808 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия оплаты** | 100% предоплата за приобретаемый объект |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 30 декабря 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 19.10.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 27 декабря 2016 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/**



Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Здание магазина №70** | 92,1 кв.м | 600/С-134991 | Минский р-н, Михановичский с/с, д. Михановичи |

Составные части и принадлежности: две пристройки, сарай, крыльцо, рампа

**Сведения о земельном участке:** пл. 0,0581 га предоставлен на праве аренды сроком по 07.11.2041 для обслуживания здания магазина №70 с установленными ограничениями (водоохранная зона водных объектов)

**Начальная цена с НДС 20% – 9 900 руб. 00 коп. (снижена на 40%)** (99 000 000 бел. руб.)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано **в газете «Звязда» от 07.10.2016**

**Аукцион состоится 12.01.2017** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 10.01.2017** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**


■ Энергетыка

# ЗЛОСНЫЯ НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКІ ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ СВЯТЛА?

**Запазычанасць суб'ектаў гаспадарання за энергію і газ на ўнутраным рынку краіны складае каля 700 млн долараў, паведаміў намеснік міністра энергетыкі Вадзім ЗАКРЭЎСКІ.**

Паводле яго слоў, гэтая запазычанасць паявілічваецца. У такой сітуацыі для пагашэння даўгоў даводзіцца прыцягваць крэдыты на папаўненне абаротных сродкаў. «Прадпрыемствы Міністэрства энергетыкі вымушаны браць крэдыты і забяспечваць своечасовыя разлікі са знешнім пастаўшчыком энерганосьбітаў», — паведаміў Вадзім Закрэўскі. Намеснік міністра адзначыў, што Мінэнерга мае намер і ў далейшым прытрымлівацца жорсткай палітыкі ў адносінах да неплацельшчыкаў. Іх могуць нават адключаць ад электраэнергіі.

## СТРОГА ПА ГРАФІКУ

Спецыяліст адзначыў, што адхіленняў ад графіка будаўніцтва Беларускай АЭС няма. Вадзім Закрэўскі расказаў, што налета на пляцоўцы ў Астраўцы плануецца будаўніцтва машыннай залы, мантаж турбіннага абсталявання і дапаможнага абсталявання турбіннага цэха. Працягнуцца работы па рэактарнай зале. Адказваючы на пытанне аб кадравай сітуацыі, Вадзім Закрэўскі адзначыў, што дэфіцыту спецыялістаў няма. «Па персанале, які зараз задзейнічаны зыходзячы з аб'ёму работ па сеткавым графіку, у нас пытанняў няма», — дадаў ён.

## ПОШУК КАМПРАМІСУ

Прадстаўнік Мінэнерга таксама паведаміў, што Беларусь і Расія працягваюць узгадненне аб'ёмаў паставак электраэнергіі на 2017 год. «Баланс электрычнай энергіі з расійскім бокам яшчэ не ўзгоднены. За гэты год імпартавана каля 3,1 млрд кВт.гадз. Па наступным годзе не ўзгоднены пакуль яшчэ кошт і, адпаведна, аб'ёмы электрычнай энергіі не вызначаныя», — сказаў Вадзім Закрэўскі. Ён падкрэсліў, што гэтая сітуацыя «не выклікае дысбалансаў» і на спажыўцах ніяк не адбіваецца. «Калі расійскім бокам будзе прапанаваны прымальны кошт электраэнергіі, зыходзячы з таго сабекошту, якога мы дасягнулі ўжо ў гэтым годзе, мы, натуральна, разгледзім неабходнасць куплі электраэнергіі ў Расіі», — растлумачыў ён.

Вадзім Закрэўскі таксама адзначыў, што Беларусь на перамовах па газе з Расіяй выступае за стварэнне роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання дзвюх краін у галіне тарыфаў па энерганосьбітах. Гэта датычыцца і перспектыў стварэння агульных рынкаў электраэнергіі і газу ў ЕАЭС.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Падпіска-2017

## Сустрэнемся на пошце!

Звязда. Да чытача з любоўю!

Зусім хутка настане новы, 2017-ты. Поўным ходам ідзе падрыхтоўка да самых любімых навагодніх і калядных свят. А мы лічым сапраўдным святам сустрэчы са сваімі чытачамі. Таму ў перадгавагодняй мітусні не забываем выпраўляцца ў шпацыр па самых розных кутках роднай Беларусі, каб адведаць людзей, для якіх «Звязда» насамрэч родная газета на роднай мове. Мы пераканаліся, што многія ўжо не ўяўляюць без свайго жыцця без нашага выдання. Як тут не завітаць у госці?

Заўтра звяздоўцы едуць адразу ў некалькі рэгіёнаў — сустрэчы адбудуцца ў Віцебскай і Мінскай абласцях. **22 снежня Дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ў адналькавы час — з 10 да 14 гадзін — на Гарадоцкім, Нясвіжскім і Маладзечанскім вузлах паштовай сувязі.** Тым, хто падпішацца, — звяздоўская падарункі на доўгую памяць. Прыходзьце — варта пабачыцца!

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# КАБ ЁЛКА НЕ САПСАВАЛА СВЯТА

**За паўтара тыдня перад надыходам Новага года святочная мітусня пераходзіць у актыўную фазу. Набыць да свята трэба многа рэчаў, а часу застаецца не так шмат. Але як падрыхтавацца да яго сустрэчы правільна з пункту гледжання супрацьпажарнай бяспекі? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з начальнікам рэспубліканскага цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Аленай ДЗМІТРУК.**



## Крок 1. Як выбраць святочнае дрэва?

Калі вы вырашылі ўсталяваць дома жывое святочнае дрэва, то ў такім выпадку не трэба звяртаць увагу на елкі, якія спілавалі даўно. У стопліст таксама трэба ўнесці дрэва, з якога асыпаецца жоўтая хвоя, з падсечаным ствалом і ломкімі галінамі. Лепш не адцягваць набыццё святочнай прыгажуні да апошніх дзён старога года. Да гэтага часу выбар ужо сур'ёзна зменшыцца, а не раскупленыя, як правіла, елкі з якімісьці дэфектамі.

Калі ж вы спынілі свой выбар на штучнай елцы, то праблем з іх асартыментам у крамах не будзе. Але тут ёсць свае «падводныя камяні». Перад набыццём елкі папрасіце ў прадаўца інструкцыю да елкі і сертыфікат якасці. Там павінен быць прапісаны яе хімічны склад. Калі ў гэты спіс патрапілі фармальдэгід, смолы ці метылен, то лепш такое дрэва паставіць назад. Справа ў тым, што гэтыя атрутныя рэчывы пры награванні ад гірлянд будуць выдзяляцца ў навакольнае паветра. Некаторыя вытворцы хітрУюць і наогул не пазначаюць у суправаджальным дакументце і на ўпакоўцы склад штучнага дрэва. Але калі так робіцца, значыць, такую елку лепш не купляць?

Самымі бяспечнымі сёння лічацца елкі, зробленыя з палімераў з антыпірэнамі. Менавіта апошнія хімічныя злучэнні перашкаджаюць яе ўзгаранню.

## Крок 2. Устаноўка

Проста прынесці лясную прыгажуню дадому і паставіць яе на крыжавіну мала. Трэба загадзя паклапаціцца пра месца ўстаноўкі. Дрэва не павінна перашкаджаць свабодна хадзіць, загароджваць дзверы. Абагравальнікі таксама лепш прыбраць ад яго далей, як і дываны. Елка павінна быць добра замацавана — малыя дзеці ці хатнія жывёлы могуць паваліць дрэва. Галінкі і вярхушкі елкі не павінны дакранацца да столі, сцен і хатніх рэчаў.

## Крок 3. Выбіраем электрагірлянду

Першае, на што трэба звярнуць увагу пры набыцці зіхатлівай стужкі, — гэта наўнасць сертыфіката бяспекі. Аднак пра суправаджальныя дакументы пры набыцці святочнай забаўкі мала хто ўспамінае. На думку многіх пакупнікоў, галоўнае — гэта даўжыня ўпрыгажэння, колькасць рэжымаў і колераў. І дарэмна: бо галоўнае — пажарная бяспека.

У сертыфікаце якасці павінна быць пазначана, ці пакрыты гірлянды вогнеахоўным саставам. Лепш спыніць выбар на святлодыёдных стужках. Яны каштуюць крыху даражэй, але затое не награваюцца (у адрозненне ад класічных лямпачак) і да таго ж дапамагаюць сэканоміць на плаце за электрычнасць.

Некаторыя ўмельцы робяць гірлянды саматужна, а ў якасці асвятлення выкарыстоўваюць лямпы напальвання. Але ж гірлянда на ёлцы сама па сабе не віснуць. Яна будзе дакранацца да ўпрыгажэнняў, каляровай паперы, пластыку. А тут да пажару ўсяго адзін крок...

Існуюць і розныя тыпы гірлянд. Ёсць у продажы стужкі як для двара, так і для памяшкання. Прычым ліхтарыкі, прызначаныя для эксплуатацыі на свежым паветры, уключаць у хаце можна спакойна. А вось у адваротны бок гэта не праце. Гірлянды, якія прызначаны для работы ўнутры памяшкання, маюць даволі кепскую абарону ад вільгаці і тонкія правады. Экзамен на трываласць яны праваляць пры першай жа істотнай змене надвор'я. У выніку — кароткае замыканне з перспектывай вельмі сур'ёзнага пажару.

Калі ўстаць ноччу, то відаць, як у вокнах шматпавярховых дамоў на розныя лады зіхацяць гірлянды. Гэта прыгожа, але... адначасова небяспечна.

Гірлянда — прыбор вельмі капрызны, звязаны з пастаяннымі зменамі ў спажыванні электраэнергіі. Да таго ж нельга адначасова ўключаць больш за тры агрэгаты ў адну разетку — можа здарыцца кароткае замыканне. Таму лепш за ўсё гірлянду на ноч выключыць. Як і тады, калі сыходзіце з дома.

## Крок 4. Падбіраем святочныя касцюмы

Іх нельга вырабляць з марлі і ўпрыгожваць дэталямі з ваты і паперы. Самы бяспечны матэрыял для карнавальнага ўбору дзіцяці — гэта лён. Касцюмы, зробленыя з паперы ці з сінтэтыкі, загараюцца куды лягчэй. Яны могуць успыхнуць нават ад звычайнага бенгальскага агню ў руках малога.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

*schklennik@zviazda.by*

### Калі дрэва загарэлася...

Першае, што трэба зрабіць у такім выпадку — абясточыць памяшканне, вывесці з яго ўсіх людзей і тэрмінова патэлефанаваць па нумары 101 ці 112. За той час, пакуль ратавальнікі будуць ехаць, можна спрабаваць тушыць пажар самаму. Елку трэба абрынуць на падлогу і накрыць шчыльнай тканінай ці коўдрай. Калі няшчасце адбылося з натуральным дрэвам, то патушыць яго крыху прасцей: дастаткова затоптваць палаючыя галінкі пад тканінай па ўсёй паверхні дрэва, пакуль гарэнне не спыніцца. Паскорыць працэс тушэння дапамогуць невялікія порцыі вады.

А вось калі ваша святочнае дрэва штучнага паходжання, то пра ўжыванне вады трэба забыцца. Справа ў тым, што падчас гарэння сінтэтычныя матэрыялы вельмі добра плавяцца і расцякаюцца. Кроплі вады, якія трапяць на палаючую паверхню, зробяць толькі горш — мікраскапічныя кропелькі пластыку будуць разлятацца наўкол і падпальваць усё на сваёй траекторыі. Як вынік, плошча гарэння будзе толькі імкліва павялічвацца. Да таго ж палаючыя палімеры выдзяляюць вельмі таксічныя рэчывы. Таму адзіная супрацьпажарная зброя ў гэтым выпадку — вогнетушыцель ці пясок. Але калі справіцца з агнём у першыя хвіліны не атрымалася — неадкладна пакіньце памяшканне і чакайце прыезду пажарных разлікаў.